К. Ю. Осінцава

# ВЫКАРЫСТАННЕ ЭЛЕМЕНТАЎ ПРАБЛЕМНАГА НАВУЧАННЯ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ РОДНАЙ МОВЫ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*kisaenka@gmail.com;*
*навук. кір. – І. Э. Саўко, канд. пед. навук, дац.*

На аснове аналізу метадычнай літаратуры разглядаюцца сутнасць праблемнага навучання, прыёмы стварэння праблемных сітуацый у аспекце магчымасці выкарыстанння іх пры навучанні роднай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Вылучаны элементы тэхналогіі праблемнага навучання, якія могуць быць выкарыстаны пры выкладанні беларускай мовы.

***Ключавыя словы:*** праблемнае навучанне; праблемная сітуацыя; метадычныя прыёмы стварэння праблемных сітуацый.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі стварэнне ўмоў для раскрыцця інтэлектуальных і творчых здольнасцей школьнікаў з'яўляецца адной з прыярытэтных задач, вырашэнню якой можа садзейнічаць прымяненне элементаў праблемнага навучання. У метадычнай літаратуры існуюць публікацыі па праблеме выкарыстання праблемнага навучання настаўнікамі роднай мовы, напрыклад беларускай ці рускай.

На думку Н. У. Без'языкавай, праблемнае навучанне на ўроках рускай мовы можна назваць універсальным, паколькі «яно забяспечвае развіццё кожнага навучэнца, з'яўляецца ключом да поспеху і творчасці, спрыяе развіццю пазнавальнай, камунікатыўнай, творчай і практычнай дзейнасці навучэнцаў, станаўленню асобы дзіцяці, гатоўнасці выпускніка школы выкарыстоўваць засвоеныя веды і ўменні для вырашэння практычных задач у рэальным жыцці, а настаўніку дазваляе зрабіць цікавым кожны ўрок» [1, с. 19].

Арганізацыя праблемнага навучання прадугледжвае прымяненне такіх метадаў і прыёмаў выкладання, якія прыводзілі б да ўзнікнення праблемных сітуацый і прадвызначалі прымяненне адпаведных метадаў навучання.

На думку І. С. Шаламіцкай, праблемныя метады заснаваныя на стварэнні праблемных сітуацый, актыўнай пазнаваўчай дзейнасці вучняў у пошуку і вырашэнні цяжкіх пытанняў, якія патрабуюць актуалізацыі ведаў, умення

бачыць за асобнымі фактамі іх сутнасць. Сярод праблемных метадаў, якія можна выкарыстаць пры навучанні беларускай мове, вылучаюцца наступныя:

праблемнае выкладанне матэрыялу;

пошукавая гутарка;

самастойная пошукавая і даследчая дзейнасць вучняў [2].

І. С. Шаламіцкая называе такія метадычныя прыёмы для стварэння праблемнай сітуацыі.

- Праблемная сітуацыя з «цяжкасцю», у аснове якой ляжыць супярэчнасць паміж неабходнасцю выканаць заданне і немагчымасцю гэта зрабіць без новых ведаў.
- Дыялог, які паслядоўна падводзіць да новай тэмы. Успомніўшы веды па пэўнай тэме, выканаўшы звыклыя заданні, прааналізаваўшы і параўнаўшы матэрыял, вучні прыходзяць да фармуліроўкі тэмы ўрока.
- Лінгвістычны эксперымент, падчас якога адны марфалагічныя формы або сінтаксічныя канструкцыі замяняюцца другімі.
- Паведамленне настаўнікам тэмы ў гатовым выглядзе, але з матывацыйнай «плямай» [2].

А. А. Масквічова пералічвае наступныя метадычныя прыёмы стварэння праблемных сітуацый пры навучанні рускай мове.

- Настаўнік падводзіць школьнікаў да супярэчнасці і прапануе ім самім знайсці спосаб яе вырашэння.
- Настаўнік сутыкае супярэчнасці ў практычнай дзейнасці вучняў па прымяненні тэарэтычнага матэрыялу.
- Настаўнік выкладае розныя пункты гледжання на адно і тое ж пытанне.
- Настаўнік прапануе разгледзець з’яву з розных пазіцый.
- Настаўнік падахвочвае навучэнцаў рабіць параўнанні, абагульненні, вывады, супастаўляць факты.
- Настаўнік ставіць канкрэтныя пытанні на абагульненне, абгрунтаванне, канкрэтызацыю і інш.
- Настаўнік вызначае праблемныя тэарэтычныя пытанні і практычныя заданні.
- Настаўнік ставіць праблемныя задачы з супярэчлівымі, недастатковымі або залішнімі зыходнымі дадзенымі, з нявызначанасцю ў пастаноўцы пытання, са спецыяльна зробленымі памылкамі і інш. [3].

Н. Л. Барадзіна прапаноўвае «на этапе вылучэння, праверкі гіпотэз і рашэння праблемы рэалізоўваць прыём "кошык ідэй": вучні "збіраюць" свае прапановы ва ўмоўны кошык. Для доказу ці абвяржэння гіпотэз прымяняюцца назіранне і аналіз, параўнанне, выдзяленне агульных прыкмет, адбор метадам выключэння і г. д.» [4].

М. І. Коржава звяртае ўвагу на тое, што «адным з метадаў абагульнення і сістэматызацыі ведаў можа быць прынцып апоры на моўныя мадэлі і алгарытмы правіла» [5, с. 21].

М. І. Коржава лічыць, што «прыёмы праблемнага выкладу ведаў могуць рэалізоўвацца на трох этапах урока рускай мовы:

пры актуалізацыі ведаў;

пры пастаноўцы праблемы;

пры "адкрыцці" дзецьмі новых ведаў» [5, с. 16].

У педагагічнай навуцы часцей за ўсё рэкамендуюць выкарыстоўваць праблемныя сітуацыі на этапе знаёмства з новай тэмай. Але, на думку В. С. Фаміных, досыць выйгрышным элементам урока рускай мовы можа стаць праблемная сітуацыя і на этапах замацавання, сістэматызацыі і абагульнення ведаў [6, с. 5].

І. С. Шаламіцкая ўпэўнена, што «на этапах замацавання, сістэматызацыі і абагульнення ведаў дзейснымі будуць... стварэнне алгарытмаў, кластараў, выкананне лабараторных работ, лічбавых дыктантаў. На этапе актуалізацыі ведаў апраўданым будзе выкарыстанне "мазгавога штурму", супастаўлення фактаў, параўнання» [2].

В. В. Казлова вылучае наступную структуру праблемнага ўрока рускай мовы.

- Узнікненне праблемнай сітуацыі і пастаноўка праблемы.
- Вылучэнне здагадак і абгрунтаванне гіпотэзы.
- Доказ гіпотэзы.
- Карэкціроўка правільнасці рашэння праблемы [7, с. 7-8].

Ю. К. Хісматуліна падкрэслівае, што «методыка праблемнага навучання ўяўляе сабой сістэму дзеянняў, якая складаецца з 4 этапаў дзейнасці:

Убачыць, знайсці праблему.

Сфармуляваць праблему ў выглядзе праблемнага пытання.

Знайсці варыянты рашэння.

Выбраць аптымальнае рашэнне» [8].

На падставе гэтага Ю. К. Хісматуліна вылучае тры віды праблемнага ўрока рускай мовы:

праблемна-даследчы (вучні выконваюць усе чатыры дзеянні самастойна);

праблемна-пошукавы (настаўнік прапануе праблему, а вучні шукаюць варыянты рашэння і аптымальны варыянт);

праблемна-абагульняючы (вучні знаходзяць толькі аптымальны варыянт) [8].

Н. Л. Барадзіна вылучае наступныя магчымыя памылкі пры правядзенні ўрокаў мовы на аснове праблемнага навучання:

- Праблемныя пытанні і заданні сфармуляваны недакладна, не ўлічаны тэмп работы кожнага вучня.
- Заданні падабраны без уліку ўзроставых і індывідуальных асаблівасцей вучняў, што прыводзіць да адсутнасці цікавасці да тэмы ўрока [4].

Найбольш складаным этапам праблемнага навучання на ўроках беларускай мовы, на думку В. Кабешавай, з'яўляецца стварэнне праблемнай сітуацыі. Яна лічыць, што «для фармулявання праблемнага пытання неабходна захоўваць дзве ўмовы: пытанне павінна ўтрымліваць пазнавальную цяжкасць і бачныя межы вядомага і невядомага. Таксама пытанні павінны быць зарыентаваны на сітуацыю, якая пабуджае да пошуку» [9].

Даследчыкі заўважаюць, што пры выкарыстанні праблемнага навучання ўзрастае асобасная ўключанасць школьнікаў у вучэбны працэс, развіваецца інтэлектуальны патэнцыял вучняў, уменне ставіць і вырашаць праблему, даказваць, абвяргаць, аналізаваць, параўноўваць, будаваць аналогіі, абагульняць і рабіць вывады з атрыманай інфармацыі, пашыраецца кругагляд, павышаецца актыўнасць вучняў на ўроку [1, с. 18]. Такім чынам, праблемнае навучанне спрыяе фарміраванню развітой асобы, здольнай лагічна мысліць, назапашваць і сістэматызаваць веды, самастойна вырашаць праблемы.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Безъязыкова Н. В.* Технология проблемного обучения на уроках русского языка и литературы // Образование и воспитание. 2020. № 1 (27). С. 17–19.
2. *Шаламіцкая І. С.* Набываць веды намаганнямі думкі. URL: https://www.n-asveta.by/dadatki/asambleya/2016/shalamitskaya.pdf (дата звароту: 10.12.2021).
3. *Москвичева Е. А.* Использование технологии проблемного обучения на уроках русского языка и литературы как эффективный способ развития учащихся. URL: https://urok.1sept.ru/articles/595721 (дата обращения: 01.12.2021).

4. *Барадзіна Н. Л.* Прыёмы стварэння праблемных сітуацый на ўроках беларускай мовы. URL: https://vesti.slutsk-vedy.gov.by (дата звароту: 27.02.2022).
5. *Коржева М. И.* Технология проблемного обучения на уроках русского языка и литературы как средство развития мыслительных способностей учащихся. URL: http://podolsoh.ucoz.ru/teacher/Korgeva/tekhnologija_problemnogo_obuchenija_na_urokakh_rus.pdf (дата обращения: 28.11.2021).
6. *Фоминых О. С.* Приемы использования проблемных технологий на уроках русского языка и литературы. URL: https://www.yugschool2.ru/images/portfolioteacher/fominyh/opyt.pdf (дата обращения: 01.12.2021).
7. *Козлова О. В.* Технология проблемного обучения на уроках русского языка и литературы. URL: file:///C:/Users/Admin/Desktop/Tehnologiya-problemnogo-obucheniya-na-urokah-russkogo-yazyka-i-literatury.pdf (дата обращения: 28.11.2021).
8. *Хисматулина Ю. К.* Проблемное обучение на уроках русского языка. Составление конспекта. URL: https://www.uchportal.ru/publ/23-1-0-10125 (дата обращения: 06.12.2021).
9. *Кабешава В.* Праблемнае навучанне як спосаб развіцця мысліцельнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы і літаратуры. URL: https://ng-press.by/2021/01/02/prablemnae-navuchanne-yak-sposab-razvitstsya-myslitselnaj-dzejnastsi-vuchnyau-na-urokah-belaruskaj-movy-i-litaratury (дата звароту: 26.11.2021).